Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Орган Давід-Гарадоцкага РК КП(б)Б і Райвыканкома.

№ 9(13)
Чацвер 1 сакавіка 1945 года
Цана 15 кап.

ПРАЦОЎНЫЯ СОВЕЦКАГА САЮЗА! КЛОПАТЫ АБ СЕМ'ЯХ ФРАНТАВІКОЎ З'ЯЎЛЯЮЦЦА СВЯШЧЭННЫМ АБАВЯЗКАМ УСІХ СОВЕЦКІХ ПАТРЫЁТАЎ. АКРУЖЫМ УСЕАГУЛЬНАЙ УВАГАЙ І КЛОПАТАМІ СЕМ'І ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ РАДЗІМЫ!

(З заклікаў ЦК ВКП(б) да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі).

## Лепш кіраваць работай агіткалектываў

Масава—палітычная работа сярод насельніцтва—пярвейшы абавязак кожнага комуніста, комсамольца, кожнага агітатара.

Уся работа агітатара павінна мабілізоўваць працоўных на ўсямерную дапамогу фронту, на хутчэйшае аднаўленне гаспадаркі, разбуранай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, на вырашэнне канкрэтных задач, якія стаяць у даны момант перад раёнам.

Для таго, каб агітатар змог справіцца з гэтай пачэснай работай, каб слова агітатара панімала і мабілізоўвала шырокія колы насельніцтва, было даходчывым да свядомасці кожнага грамадзяніна, трэба кратліва працаваць з агітатарамі, вучыць, дапамагаць і накіроўваць іх работу. А гэта справа кіраўніка агіткалектыва.

Некаторыя кіраўнікі агіткалектываў, як Лядзецкага—т. Харлан, Сьгомельскага—т. Федасееў, сістэматычна праводзяць семінары агітатараў, вучаць іх, як праводзіць бяседы, чытку газет, правяраюць іх работу. Гэтыя сельсоветы ідуць уперадзе па выкананню ўсіх гаспадарча-палітычных задач.

Але маюцца і такія кіраўнікі агіткалектываў, якія адносяцца к гэтай рабоце фармальна. Уся іх работа звялася к складанню спісаў агітатараў.

Да ліку такіх адносіцца кіраўнік Веляміцкага агіткалектыва т. Навалаеў, які за 4 месяцы ніводнага разу не сабраў агітатараў. Агітатары ніякай работы не вядуць.

Не лепш абстаіць справа з кіраўніцтвам агітатарамі ў Ольшанскім агіткалектыве, дзе кіраўніком т. Каленік, які з снежня месяца не знайшоў часу сабраць агітатараў і не быў у сельскім совеце. У выніку недастатковай палітычнай работы сярод насельніцтва, сельскі совет адзін з адстаючых у раёне па выкананню ўсіх гаспадарча-палітычных задач: план мясапаставак выканан на 8 процантаў, сенапастаўкі на 18 процантаў, збор ваеннага падатку за 1944 г. на 13 процантаў. Адстае сельсовет і па лесанарыхтоўкам і лесавывазцы.

Такія адносіны гэтых таварышоў к важнейшай рабоце далей не цярпімы. Яны павінны помніць, што асабістую адказнасць перад райкомам партыі за становішча масава-палітычнай работы сярод насельніцтва нясуць кіраўнікі агіткалектываў.

Задача кожнага кіраўніка агіткалектыва—сістэматычна кіраваць агітатарамі, дапамагаць ім у растлумачэнні сярод шырокіх мас народа палітыку нашай партыі, бягучыя палітычныя падзеі. Каб слова агітатара мабілізоўвала і паднімала народ на вырашэнне гаспадарча-палітычных задач.

## УРАЧЫСТАЕ ПАСЕДЖАННЕ, ПРЫСВЕЧАНАЕ 27-Й ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

22 лютага ў памяшканні раённага ДСК адбылося ўрачыстае пасяджанне Раённага Совета дэпутатаў працоўных, с умсна з партыйнымі, комсамольскімі і грамадскімі арганізацыямі і прадстаўнікамі ад воінскіх часцей, прысвечанае 27-ай гадавіне Чырвонай Арміі.

Пад бурныя апладысменты ўпачотны прэзідыум урачыстага паседжания выбіраецца Палітбюро ЦК ВКП(б) начале з таварышам Сталіным.

Змястоўны даклад аб 27-ай гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога флоту зрабіў маёр Котаў.

Удзельнікі ўрачыстага паседжання паслалі прывітальнае пісьмо правадыру народаў Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму Маршалу Совецкага Саюза таварышу СТАЛІНУ.

На ўрачыстым паседжанні прысутнічала звыш 320 чалавек.

А. Вашкоў

## Ад Совецкага Інформбюро

### З аператыўнай зводкі за 27 лютага

Войскі 2-га Беларускага фронта, прадаўжаючы наступленне, зламалі супраціўленне праціўніка на захад ад горада ХОЙНІЦЭ (КОНТІЦ) і за чатыры дні наступальных баёў прасунуліся ўперад да 70 кілометраў.

У ходзе наступлення войскі фронта на тэрыторыі Памераніі авалодалі гарадамі ШЛОХАУ, ШТЭГЕРС, ХАМЕРШТАЙН, ВАЛЬДЭНБЕРГ і БУБЛІЦ—важнымі вузламі камунікацый і моцнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў, а таксама з баямі заняли больш 100 другіх населеных пунктаў, сярод якіх буйныя населеныя пункты Польніц, Цэхлан, Ферстэнау, Дракен, Грос Клайн—Кюдэ.

У БРЭСЛАУ нашы войскі, прадаўжаючы баі па знішчэнню акружанай ў горадзе групіроўкі праціўніка, занялі 12 кварталаў.

На тэрыторыі Чэхаславакіі, на паўночны захад і захад ад горада ЛУЧЭНЕЦ, нашы войскі, дзейнічаючы ў цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці ў паласе Карпат, з баямі занялі населеныя пункты Віглям, Звол Слаціна Боровіны, Грабаў Грунь, Орэмаў Лаз Сеноград, Младніцэ.

На другіх участках фронта—пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 26 лютага на ўсіх франтах падбіта і знішчана 66 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіта самалётаў праціўніка.

## КІНО НА ВЁСЦЫ

У вёсцы Лядзец, Лядзецкага сельсовета, 27 лютага была прадэманстрыравана гукавая кінокарціна „Яна абараняе Радзіму".

Карціну прагледзела 350 чалавек.

Жыхары в. Лядзец засталіся задаволеныя гэтай кіно-карцінай.

І. Страха.

# АКРУЖЫМ КЛОПАТАМІ СЕМ'І НАШЫХ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ!

## ЗВАРОТ

### СЯЛЯН ВЁСКІ ВЕЛЯМІЧЫ ДА ЎСІХ ПРАЦОЎНЫХ ДАВІД-ГАРАДОЦКАГА РАЁНА.

**ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!**

Гераічная Чырвоная Армія з кожным днём наносіць удар за ўдарам па праклятаму ворагу. Нашы воіны, не шкадуючы свайго жыцця, змагаюцца і б'юць ворага на яго ўласнай зямлі. Недалёк той дзень, калі чырвоны сцяг перамогі ўзаўецца над цэнтрам фашысцкай бярлогі—Берлінам.

Наш доўг усімі сіламі і сродкамі дапамагаць нашай слаўнай арміі—вызваліцельніцы, акружыць усеагульнай увагай і клопатамі сем'і вызваліцеляў Радзімы, асаблівым клопатам акружыць дзяцей—сірат, бацькі якіх загінулі ў барацьбе за нашу свабоду, за шчасце нашых дзяцей.

Мы рашылі пры сельскім совеце стварыць фонд дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў, партызан і дзецям-сіратам. Мы ўжо сабралі 1300 рублёў грашыма і 45 пудоў збожжа.

Звяртаемся да Вас, таварышы, паследаваць нашаму прыкладу і распачаць збор сродкаў у фонд дапамогі сем'ям франтавікоў, партызан і дзецям-сіратам.

Акружым заботай сем'і нашы слаўных воінаў-вызваліцеляў, дзяцей-сірат! Створым пры кожным сельсовеце фонд дапамогі сем'ям франтавікоў, партызан і дзецям-сіратам!

Няхай жыве наша слаўная Чырвоная Армія, якая вызваліла нас ад нямецка-фашысцкай пакуты!

Няхай жыве дарагі наш правадыр таварыш Сталін!

Па даручэнню сялян в. Велямічы зварот падпісалі: Занкін А. М., Кузьміч А., Слуцкі В., Слуцкая М., Ранцэвіч А.

## РАМАНТУЮЦЬ ІНВЕНТАР

Разгарнуліся работы па падрыхтоўцы к веснавой сяўбе па МТС. Калектыў рабочых сабраў і закончыў рамонт усяго наяўнага сельскагаспадарчага інвентара. Прыведзены ў спраўнасці 2 радковых сеялкі, 7 параконных плугоў, 1 трактарны плуг, 7 культыватараў, 14 барон.

Значную дапамогу аказала МТС сялянам Аздаміцкага і Ольгомельскага сельсоветаў, куды былі накіраваны два кавалі, якія адрамантавалі 39 плугоў, 13 барон, 3 возы.

А. Кавалёў.

## КАЛІ ГЭТА СКОНЧЫЦЦА?

Адзінае месца для культурнага адпачынку ў райцэнтры—гэта дом соцкультуры.

Але, на жаль, наш раённы ДСК гэтаму не адпавядае. Падыходзячы да клуба яшчэ за кілометр чуцен шум. І калі хто захацеў культурна адпачыць, то замест гэтага атрымае адно мучэнне.

Пачынаецца яно каля білетнай касы, дзе заўсёды беспарадкі. За білетам дабрацца амаль немагчыма, таму што тут няма ніякай чаргі. Работнікі ДСК гэтым не цікавяцца, міліцыя бяздзейнічае.

Узяўшы, нарэшце, білет, трэба зайсці ў клуб. І вось, пасля дзесяці, а калі пашанцуе то і больш, добрых штуршкоў у спіну і бок, пасля страты 3-4-х гузікаў, глядач пападае ў зал. Але тут яго сустракае поўнае расчараванне: месц ужо няма і яму прыходзіцца ўвесь кіно-сеанс стаяць і.... за свае ўласныя грошы.

Паміраўшыся і з гэтым, глядач чакае пачатку кіно-сеанса, які зачастую замест 20 гадзін пачынаецца ў 21.

У час дэманстрацыі фільма скрозь громкія стукі ў дзверы і вокны, чуваць радыё і адначасова гукі кіно-карціны, смех, гоман, а часта і ругань. І так на працягу ўсяго сеанса.

У чым-жа тут прычына? Хто ў гэтым вінават? Безумоўна, вінават тут заг. ДСК тав. Бруцкі, органы міліцыі, а таксама сакратар РК ЛКСМБ тав. Навалаеў, якія не цікавяцца работай ДСК.

З беспарадкамі ў ДСК ужо даўно-б пара пакончыць. Дом соцкультуры трэба ператварыць у сапраўдны ачаг культуры і адпачынку працоўных горада.

Барысаў.

## КУРСЫ ТРАКТАРЫСТАЎ

Пры МТС арганізаваны і пачалі сваю работу курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў.

На курсах навучаецца 17 чалавек.

І. Клішэвіч.

## ЦІКАВАЯ КІНО-КАРЦІНА

Нядаўна вучні Давід-Гарадоцкай НСШ №1 прагледзелі кіно-карціну „Яна абараняе Радзіму". На кіно-сеансе прысутнічала 288 чалавек.

З вялікай увагай і інтарэсам дзеці глядзелі кіно-карціну. Кіно—адзін з момантаў выхавання дзяцей.

Але гэтага яшчэ не ўразумелі работнікі нашага кіно-тэатра. На дзецкіх сеансах зачастую не паказваюць адну або дзве часткі дэманстрыруемай кіно-карціны, прайці дзецям у памяшканне тэатра таксама вельмі цяжка.

Загадчыку кіно-тэатра трэба надумаць аб гэтых непарадках і добра наладзіць дэманстрацыю кіно-карцін для дзяцей.

Дырэктар НСШ № 1
г. Давід-Гарадка
С. І. Дзеленадзік.

## НАВЕСЦІ ПАРАДАК

У вядзенні райспажыўсаюза (старшыня тав. Маркоўнін) знаходзіцца цырульня.

Але хто ў ёй набываў, у таго астанецца назаўсёды непрыемнае ўражанне. Памяшканне гразнае, падлога з дня адкрыцця цырульні не мылася. Кругом валяецца смецце, пыл тоўстым слоем пакрывае ўсе прадметы, са столі звісае павуціннe.

Не лепш выглядаюць і самі цырульнікі. Працуюць яны без халатаў. Прыборы для стрыжкі і брыцця ніколі не мыюцца, не гаворачы ўжо аб дэзінфекцыі. Цырульнікі працуюць без усякага кантролю, беручы па 5 руб. за брыццё, а грошы сабе ў кішэню, бо ніякай квітанцыі не даюць.

Відаць, што старшыня райспажыўсаюза тав. Маркоўнін ніколі не брыецца ў гэтай цырульні, бо каб пабрыўся хоць раз, то навёў-бы парадак.

Не заглядваюць у цырульню і работнікі санітарнага надзора, а ўжо даўно-б пара пакончыць з такімі „парадкамі і чыстатой" у цырульні.

А. Хаустаў.

Адрас рэдакцыі: г. Давід-Гарадок, вул. Карла Маркса, 10. Адказны рэдактар А. Плаўчанка.